*УДК 392.5(476.2-37Калінкавічы)*

**А. А. Казлякоўскі**
***Навук. кір. – В. С. Новак, д-р філал. навук, прафесар***

# ТРАДЫЦЫІ ВЯСЕЛЬНАЙ АБРАДНАСЦІ ВЁСКІ САВІЧЫ КАЛІНКАВІЦКАГА РАЁНА ГОМЕЛЬСКАЙ ВОБЛАСЦІ

*У артыкуле, прысвечаным вяселлю ў вёсцы Савічы Калінкавіцкага раёна Гомельскай вобласці, разглядаюцца асобныя абрадавыя этапы і звязаныя з імі народныя вераванні. Аўтар на аснове ўласных назіранняў і матэрыялаў, запісаных ад жыхароў в. Савічы, характарызуе лакальныя асаблівасці вясельных абрадаў, звычаяў і прымеркаваных да іх народных вераванняў.*

Вясельная абраднасць беларусаў – від мастацтва, які ўстойліва захоўваецца і сёння. Праблема даследавання мясцовай спецыфікі вясельнай абраднасці – адна з найважнейшых у сучаснай фалькларыстыцы. Як рэгіянальна-лакальная з’ява вяселле Калінкавіцкага раёна ўяўляе сабой своеасаблівую сістэму лакальных традыцый. Вяселле ў кожнай з вёсак адрозніваецца непаўторнымі рысамі як на ўзроўні структуры абраду, так і на ўзроўні яго вербальнага суправаджэння. У гэтых адносінах заслугоўвае ўвагі вясельная абраднасць маёй роднай вёскі Савічы Калінкавіцкага раёна.

Менавіта вяселле лічыцца самай урачыстай падзеяй ў сямейнай абраднасці беларусаў. На пытанне, калі звычайна святкавалі вяселле, жыхарка в. Савічы Гормаш Ніна Дзмітрыеўна, 1956 г. н., паведаміла, што «абычна рабілі свадзьбу па восені, пасля работы ў полі, бо паны нядзелю гуляюць, а потым як жа жыта жаць?»

Засяродзім спачатку ўвагу на характарыстыцы давясельнага перыяду. Варта заўважыць, што адразу некалькі этапаў (сватанне і агледзіны) у нашай мясцовасці па часе іх правядзення былі аб’яднаны. Астатнія абрадавыя этапы вяселля адбываліся ў пэўнай паслядоўнасці ў адпаведнасці з мясцовай традыцыяй.

У в. Савічы, зыходзячы з успамінаў інфармантаў, жаніх і нявеста абавязкова вянчаліся ў царкве, пры гэтым звычайна хлопец са сваёй дружынай прыязджаў па нявесту, якую трэба было выкупіць: «Ну, дак шчо, дагаварываюцца на які дзень, гэта ж колісь і ў царкве, то ж цяпер у сельсавеце распісваюцца і ў ЗАГСе, а тады ж усё царкоўныя бракі былі. Згаварыліся, на які дзень, сабраліся, ужэ хлопец прыязджае, вот там сваё застолле, у дзеўкі сваё, патом ўжо

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

сабіраюцца хлопец, дружкі яго, прыязджаюць, забіраюць дзеўку і едуць у цэркаў, зараз у сельсавет, дапусцім. А штоб яе забраць, прыходзяць друзья і падружкі і яе хаваюць. Могуць пераадзець у другое свадзебнае, ну, шукайце нявесту. Выкупіць яе нада, выкуп за дзеўку» (запісана ў в. Савічы ад Гормаш Ніны Дзмітрыеўны, 1956 г. н.).

У жаніха і яго дружкаў падчас выкупу нявесты абуджалася неверагодная кемлівасць. Адзначым, што падчас яго правядзення мелі месца пэўныя нюансы, прадыктаваныя мясцовай інтэрпрэтацыяй гэтага звычаю: «У некатарых мястах было такое, еслі жаніхоў дружок зняў з нявесты туфель, то ніякага выкупа няма, усё. Дзе грашамі выкуплялі, дзе канфетамі, дажэ шуткі-прыбауткі считалася як выкуп нявесты» (запісана ў в. Савічы ад Гормаш Ніны Дзмітрыеўны, 1956 г. н.).

Нягледзячы на тое, што раней людзі, асабліва з сельскай мясцовасці, былі дастаткова набожнымі, многія з якіх прытрымліваліся язычніцкіх вераванняў. Паводле сведчанняў інфарманта, у в. Савічы было прынята ў мясцовай традыцыі адразу ж пасля цырымоніі вянчання наведваць могілкі памерлых родзічаў: «Пасля таго, як з’ездзілі ў царкву, і ўжэ едуць па такіх мястах знакомых, такіх больш пасячаемых, еслі ў жаніха ці нявесты на кладбішчы ёсць маці там, ацец, дажэ к дзеду з бабай едуць» (запісана ў в. Савічы ад Гормаш Ніны Дзмітрыеўны, 1956 г. н.). Прыведзеныя матэрыялы пацвярджаюць факт адлюстравання ў мясцовай вясельнай абраднасці ўяўленняў, звязаных з культам продкаў.

Відавочна, што здаўна ў нашай вёсцы захоўваецца і падтрымліваецца сувязь паміж светам жывых і памерлых: «Едуць, пасяшчаюць кладбішча, патом аб'язджаюць усю дзярэўню» (запісана ў в. Савічы ад Гормаш Ніны Дзмітрыеўны, 1956 г. н.).

Звычайна, калі маладыя вярталіся з-пад вянца іх спынялі і перагароджвалі дарогу: «Ставяць ваду на стулік або стол, у обшчэм, перакрываюць дарогу. Штоб дальшэ праехалі, хлопец дае выкуп за тое, штоб яго дальшэ прапусцілі. Ну, абычна што... Ставяць бутылку, да і ўсё, а закуску ўжо самі находзяць эці, што перакрываюць» (запісана ў в. Савічы ад Гормаш Ніны Дзмітрыеўны, 1956 г. н.).

Адным з атрыбутаў шчаслівага вяселля ў в. Савічы лічыцца брама, якая як сапраўдны аб’ект мастацтва прываблівае сваёй прыгажосцю і непаўторнасцю. Тут таксама мясцовыя жыхары выяўлялі творчы падыход, прапаноўвалі свае ідэі наконт яе афармлення: «Тады ўжэ прыязджаюць у хату, на парозе сустракае маці – маці нявесты ў царкву не ходзіць, яна сустракае ўжэ жаніха тут з дачкою. На ўходзе робяць такую браму – вясельную, убіраюць, увосень дажэ снапамі, каласкамі жытнімі, веткамі зялёнымі, што не

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ўспелі яшчэ пасохці дзерава, дапусцім, якое, і ўжо ручнікам звязваюць маладым рукі – адна рука дзеўкі, а другая – хлопца, і тады ўжэ маці вядзе, як зашлі ў хату, абводзіць іх вакруг стала са звязанымі рукамі» (запісана ў в. Савічы ад Гормаш Ніны Дзмітрыеўны, 1956 г. н.).

Маладыя заўсёды займалі ганаровае месца ў хаце, яны не заставаліся без увагі, таму што знаходзіліся пад апекай Бога (нягледзячы на прымхлівасць і забабоны): «Патом ужэ садзяцца госці за стол, маладыя занімаюць кут, і тады ўжо гулянка, п'янка да тых пор, пакуль не начынаюць дзяліць вясельны каравай» (запісана ў в. Савічы ад Гормаш Ніны Дзмітрыеўны, 1956 г. н.).

Паводле народных павер'яў, вясельны абрадавы хлеб сімвалізаваў шчасце і дабрабыт маладых, таму і адносіліся з высокай адказнасцю да яго падрыхтоўкі. Зыходзячы з мясцовых вераванняў, каравай павінен быў прыгатаваць не абы-хто, а тая жанчына-каравайніца, якая сама шчаслівая ў шлюбе і вядзе добрасумленны лад жыцця. Немалаважную ролю адыгрываў у правядзенні вяселля хросны, які таксама меў непасрэдныя адносіны да каравая: «Яго пякла каравайніца, гэта павінна была быць добрая жэншчына, замужняя, абавязкова каб у яе дзеткі былі. Каравай выносіць хросны бацька, еслі няма хроснага і няма роднага, то назначаюць дзядзьку якога ілі харошага саседа, іменна штоб быў сямейны чалавек, с харошай рэпутацыяй, не алкаголік, якіх цяпер могуць за кума ўзяць, і пьюць разам. Тады ў кумаўя бралі палажыцельных людзей, таму што хросны – эта ответственны за рэбёнка не толькі на этым свеце, но і на том. І еслі ён яго плоха васпітаў, то перад Богам атвячае менш яго хрэснік, як сам ацец хросны» (запісана ў в. Савічы ад Гормаш Ніны Дзмітрыеўны, 1956 г. н.).

Важнае месца ў структуры вясельнай абраднасці в. Савічы займае абрад выпечкі каравая. Звычайна каравайная абраднасць суправаджалася песнямі, у якіх знайшлі паслядоўнае адлюстраванне дзеянні, звязаныя з яго падрыхтоўкай. Як слушна адзначыў Я. Карскі, «песні пры выпечцы і падрыхтоўцы каравая ў беларусаў, як і ў маларусаў, больш носяць абрадавы характар. Кожнаму дзеянню папярэднічае просьба аб блаславенні, а само дзеянне супараваджаецца песнямі» [1, с. 357].

Кульмінацыяй вясельнай абраднасці з'яўляецца дзяльба каравая. Гэтае ганаровае права звычайна належыць хроснаму бацьку. Паводле ўспамінаў інфарманта, «каравай усё з частушкамі. Дапусцім, вызываюць у першую очарэдзь маці з бацькам:

– У нашага маладога з маладой ёсць маці з бацькам. Ласкавы былі – на каравай прыбылі.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Прыходзяць, дарацъ падаркі. Патом … браты, сёстры, дзядзькі, цёткі – усіх такім чынам вызываюць. Патом саседзі. У гарадах зараз так: прыйшлі, канверт далі, а ён ледзь пусты. А ў дзераўнях жа зусім па-другому – кажды бачыць, хто што падарыў. Тады грошай ваабшчэ мала было. І яшчэ такое – дорацъ падарак, а патом і гаворацъ: «І дару яшчэ каробачку пуху, каб нявестка пацалавала свякруху. Можна зрабіць такую каробачку або проста на славах сказаць» (запісана ў в. Савічы ад Гормаш Ніны Дзмітрыеўны, 1956 г. н.).

Як правіла, у каравайных пажаданнях адлюстроўваліся маральна-этычныя погляды беларусаў: «Дару грошы, каб мужык быў харошы», «Сыплю жменю медзі, каб сыны былі, як мядзведзі», «Дару бярозаву рошчу, каб зяць пацалаваў цёшчу» (запісана ў в. Савічы ад Гормаш Ніны Дзмітрыеўны, 1956 г. н.). Калі падзялілі каравай, то «назаўтра, абычна, у нявесты вечар гуляюць, а назаўтра, ўжо малады, вязе к сабе, еслі ў другое сяло, на конях, еслі ў гэтым сяле – то пяшком. А на наступны дзень ўжо гуляюць у хлопца» (запісана ў в. Савічы ад Гормаш Ніны Дзмітрыеўны, 1956 г. н.). Напрыканцы вясельнага застолля выконвалі абрадавыя дзеянні, звязаныя з пераводам маладой у новы статус – жаноцкі. З гэтай мэтай здымалі вясельны ўбор з галавы і завязвалі маладой хустку: «А шчэ, перад тым, як свадзьба заканчваецца, свякруха снімае маладой фату і навязвае хустку на голаву, штоб ты была дзявіца, а цяпер будзеш маладзіца» (запісана ў в. Савічы ад Гормаш Ніны Дзмітрыеўны, 1956 г. н.). Гэты абрадавы момант па-рознаму інтэрпрэтавалі ў народзе: «І ўжо дзеўкі ім прашчальную песню пяюць, а яна для понта паплача, каторая ў самым дзеле можа заплакаць, што ўжэ волі не будзе; другая будзе ад радасці плакаць, што вырвалася з-пад бацькоўскай апекі, розныя ж бацькі бываюць» (запісана ў в. Савічы ад Гормаш Ніны Дзмітрыеўны, 1956 г. н.). Калі завяршалася вяселле ў хаце маладой, то далей яно працягвалася ў хаце маладога: «Назаўтра едуць ілі ідуць к хлопцу, ну, і ўжо тое жа самае, толькі каравай дзеляць ужо з яго стараны і яго родственнікі дорацъ падаркі» (запісана ў в. Савічы ад Гормаш Ніны Дзмітрыеўны, 1956 г. н.).

Асаблівай каларытнасцю, жартамі і гумарам напоўнена пасляясельная частка, якая мае назву «петуха рабіць»: «На трэці дзень, у панядзелак, петуха робяць. Вот тады палучаецца свадзьба яшчэ красівейшая, чым была этыя два дні. Што там ужэ тварылі… Нявеста прыбіралася, а жаніху марковіну прывязалі, не будзе жа ён з голым хадзіць. Столькі ўжо рогату было … У гэты дзень маглі зварыць не толькі петуха, але і курыцу ці проста мяса натушыць. Там дажэ можа і маладых ужэ не быць, яны свадзьбу справілі, пабылі



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

трохі да і паехалі. Ужо былі другія маладыя – пераадзетыя дарослыя» (запісана ў в. Савічы ад Гормаш Ніны Дзмітрыеўны, 1956 г. н.).

Такім чынам, вясельная абраднасць в. Савічы захоўвае асноўныя моманты беларускага вяселля і вызначаецца адметнымі мясцовымі асаблівасцямі.

**Спіс літаратуры**

1 Карскі Я. Беларусы / Я. Карскі; уклад. і камент. С. Гараніна і Л. Ляўшун; навук. рэд. А. Мальдзіс; прадм. Я. Янушкевіча і К. Цвіркі. – Мінск: «Беларускі кнігазбор», 2001. – 640 с.

*УДК 398.332.2(476.2-37Ветка):811.161.1’37*

**Д. С. Корхова**
***Науч. рук. – В. С. Новак, д-р филол. наук, профессор***

## ОБРЯД ВОЖДЕНИЯ СТРЕЛЫ В ВЕТКОВСКОМ РАЙОНЕ ГОМЕЛЬСКОЙ ОБЛАСТИ

*Статья посвящена осмыслению фактических материалов, связанных с обрядом вождения стрелы. Автором проанализированы особенности вышеназванного обрядового явления, подробно рассмотрены сведения о вождении стрелы на основе собственно записанных экспедиционных материалов на территории Ветковского района Гомельской области, а также опубликованных.*

В белорусском обрядовом фольклоре имеют место уникальные явления, которых нет в устном народном творчестве других народов. Одной из таких фольклорно-этнографических жемчужин является обряд «Вождение стрелы», который и сегодня не только сохраняется в памяти старожилов Ветковского района, но и продолжает активно бытовать, в чём и пришлось убедиться всем студентам-участникам летней фольклорной экспедиции 2022 г.

Можно предположить, что название обряда произошло от зачина хороводной песни *«Да й пашла стрэла да и вдоль села»* или *«Ой, бягить сула да й удоль села».* При этом «стрелой» назывались само шествие всех участников шеренгой вдоль улицы, песня, группа исполнительниц и предметы, которые закапывали в землю, когда завершались обрядовые действия. Смысл обряда – отвести стрелу от



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ